# Стылі і жанры тэкстаў

**Практыкаванне.** Вызначце стыль і жанр фрагментаў тэкстаў.

1. Рэльеф Беларусі раўнінны, у ім спалучаюцца плоскія, хвалістыя, узгорыстыя ўчасткі. Тэрыторыя Беларусі знаходзіцца ў басейнах Чорнага і Балтыйскага мораў. У Беларусі больш за 10 тысяч азёраў. У асобных раёнах яны злучаны невялікімі пратокамі, рэчкамі і ўтвараюць цэлыя групы. Прыроднае расліннае покрыва займае каля 67 % тэрыторыі Беларусі. Адносіцца да 2 геабатанічных абласцей: таежнай хвойна-лясной і Еўрапейскай шыракаліста-лясной. З поўначы на поўдзень цёмнахвойныя яловыя лясы зменьваюцца шыракалістымі. *(Паводле Беларускай Энцыклапедыі.)*

2. Абітурыенты, залічаныя на 1-ы курс гістарычнага факультэта, павінны да 3 верасня з'явіцца ў кабінет сакратара для атрымання неабходнай дакументацыі. Асобы, якія маюць патрэбу ў атрыманні месца ў інтэрнаце, могуць напісаць на імя дэкана заяву, якая будзе разглядацца на сумесным пасяджэнні дэканата і студэнцкага савета.

3. Падручнік ["Курс беларускай мовы", аўтары Л.І.Сямешка і інш] уключае праграмны матэрыял па курсу беларускай мовы. У ім упершыню даецца апісанне моўнай сістэмы з арыентацыяй на функцыянальна-камунікатыўны аспект. Практычныя заданні маюць на мэце выпрацаваць уменне аналізу моўных з'яў, асаблівасцей іх ужывання ў кантэксце, самастойнага адбору моўнага матэрыялу і яго выкарыстання ў маўленчай практыцы.

4. Абодва [хлопцы] вучыліся ў тэхнікуме ў адным з абласных цэнтраў Беларусі і былі самымі старannымі ўдзельнікамі краязнаўчага гуртка. Можа, яны таму так цікавіліся краязнаўствам, што нарадзіліся ў горадзе і ўвесь свой век пражылі ў ім. Прыроду, лес, вёску хлопцы ведалі толькі з тых экскурсій, якія наведвалі, калі вучыліся ў школе. Далей як за дзесяць кіламетраў ад горада ім ніколі не даводзілася быць. Вучыліся абодва добра, чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх — Жуля Верна, Майна Рыда, Купера і іншых. Цікавілі іх розныя дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся шмат гадоў таму. Марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была непадалёк ад горада. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, сланоў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі. Марылі пра мора, караблі, а не бачылі вялікага возера за дваццаць кіламетраў ад горада. *(Паводле Янкі Маўра.)*

5. Яны розныя — заснавальнікі новай беларускай літаратуры: парывісты, тэмпераментны, узнёслы Купала і ўраўнаважаны, рэалістычны Колас. Адзін — вястун і прарок, другі — летапісец і філосаф. Але ў абодвух тонкае адчуванне душы чалавека, дакладнае веданне яго побыту і працы.

Часовае ў іх зліта з вечным, нацыянальнае — з агульначалавечым. Самаахвярна любілі яны сваю родную зямлю і беларускі народ, матчыну песню, поўную хараства і замілавання. Лёс даў ім рэдкі талент, але і не пашкадаваў выпрабаванняў на трываласць і адданасць Бацькаўшчыне. *(Паводле Г.Бураўкіна.)*

**Выканайце тэставыя заданні**.

Абгрунтуйце свой выбар.

| **Фармулёўка задання** | **Матэрыял** |
|---|---|
| **1**. Выпішыце слова, якое ў прыведзеным радзе абазначае лішні жанр маўлення | *аповесць, казка, аб'ява, раман, апавяданне* |
| 2. Запішыце не названы ў прыведзеным радзе стыль маўлення | *афіцыйна-дзелавы, мастацкі, навуковы, гутарковы* |
| 3. Выпішыце слова, якое ў прыведзеным радзе абазначае лішні жанр маўлення | *даверанасць, нарыс,фельетон, нататка,рэпартаж* |
| 4. Выпішыце слова, якое ў прыведзеным радзе з'яўляецца лішнім | *рэпартаж, фельетон, кодэкс, нарыс, інтэрв 'ю* |
| 5. Выпішыце лішняе слова ў прыведзеным радзе | *указ, манаграфія, нататка, стісанне, гутарка* |